подберезовик; здор – вздор; кватэрка – квартирка; мур – амур, муравей, муровать; прыпар – препарат, припаривать; пячонік – печь, печенка.

Анкетирование было анонимным и проводилось среди студентов филологического факультета Витебского государственного университета имени П.М. Машерова. В опросе приняли участие 121 человек в возрасте от 17 до 23 лет. Для чистоты эксперимента нами был соблюден половой паритет его участников (54 мужчины и 67 женщин). Интересным нам представляется также и тот факт, что родным русский язык назвали 86 респондентов (71,1%), белорусский – 25 человек (20,6%), для 10 студентов оба языка являются родными (8,3). Полученные результаты перевода отражены в таблице:

| Количество правильных переводов (%) | ***Безэквивалентные лексические единицы*** | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | *абшыванка* | *знічка* | *бярозавік* | *здор* | *кватэрка* | *мур* | *прыпар* | *пячонік* |
| | 21,49 | 42,98 | 23,97 | 1,65 | 0,00 | 12,4 | 12,4 | 6,61 |

**Заключение.** Таким образом, данные проведенного эксперимента показывают, что только около 15,2% переводов студентов были правильными. Однако нам не встретилось ни одной анкеты с полностью правильным переводом. А число правильно выполненных переводов безэквивалентных слов не зависело от того, какой язык респондент считает своим родным. Анализ неправильных ответов показывает, что большинство из них как раз и связан с тесным буквенно-звуковым сходством выбранных нами слов. Безусловно, полученные результаты нельзя назвать абсолютными для всей Беларуси, однако, они дают достаточную почву не только для дискуссий относительно статуса и перспектив развития государственных языков в нашей стане, но и указывают на необходимость дальнейшего законодательного совершенствования отдельных аспектов языковой политики, которая неразрывна связана с вопросами государственности, национально-этническим самоопределением и т.д.


Список литературы

1. Бахтикиреева У.М. Теория билингвизма в русском языкознании // Лингвистика XXI века : сб. науч. ст. к 65-летнему юбилею проф. В.А. Масловой / соред. В.В. Колесов, М.В. Пименова, В.И. Теркулов. – 2-е изд., стер. – М. : Флинта, 2014. с. 45–56.
2. Мечковская Н.Б. Социальная лингвистика: пособ. для студентов гуманит. вузов и учащихся лицеев / Н.Б. Мечковская – 2-е изд., испр. – М. : Аспект Пресс, 2000. – 207 с.
3. Шкраба, І.Ш. Самабытнае слова : слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі (у рускамоўным дачыненні) / І.Ш. Шкраба. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1994. – 223 с.


## КАНЦЭПЦЫЯ АСОБЫ Ў ЛІРЫЦЫ 60-х ГАДОЎ ХХ СТАГОДДЗЯ


*В.В. Лапацінская*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Кожны этап развіцця грамадства характарызуецца сваімі істотнымі асаблівасцямі, якія вызначаюць спецыфіку культурнага і літаратурнага модусу. 60-я гады ХХ стагоддзя – гэта своеасаблівы перыяд у гісторыі і этап літаратурнага працэсу. Час паставіў на парадак дня праблему актывізацыі ролі чалавека ў жыцці, адлюстравання багацця яго ўнутранага свету, “узвышэння простага чалавека” [5, 72], – так характарызуе М.Мішчанчук эпоху, якую мы аналізуем. **Мэта** даследавання – раскрыць асаблівасці стварэння канцэпцыі асобы ў лірыцы 60-х гадоў ХХ стагоддзя.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам дадзенага даследавання стала паэзія перыяду “адлігі”**.** Метады даследавання: функцыянальна-гістарычны, тыпалагічны, герменеўтычны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пацяпленне палітычнага клімату і паслабленне кніжнай цэнзуры выклікалі ажыўленне грамадскага і культурнага жыцця. Людзі паступова пачынаюць усведамляць сваю асабістую значнасць і адказнасць за тое, што робіцца ў грамадстве, а пісьменнікі, у сваю чаргу, праяўляць вострую зацікаўленасць жыццём “прыватнай асобы”. “Узвышэнне чалавека” [6] па ўсіх пазіцыях становіцца тэндэнцыяй часу: “Паэтаў захапіла ўжо сама магчымасць грамадска актыўнага служэння, сцвярджэння чалавечага права на ўласнае выказванне, свой погляд, думку, сваё права на ўдзел у вырашэнні набалелых праблем часу. Захапіла прапаведзь вяртання чалавеку яго элементарных, адабраных культаўскім дыктатам, дэмакратычных правоў і свабод”, – чытаем у артыкуле вядомага даследчыка М.Арочкі [1, 235].



Репозиторий ВГУ

Перыяд 60-х гадоў XX стагоддзя быў пазначаны выразным рухам грамадскай свядомасці па шляху адмаўлення ад масавасці як прынцыпу духоўнага жыцця да прызнання прыярытэтнай вартасці індывідуума ў ім. Але з гэтым індывідуалізмам вялася жорсткая барацьба, напрыклад, творы Аксёнава, Гладзіліна, Кузняцова крытыкаваліся менавіта за такі "рух".

На думку значнай часткі даследчыкаў, асоба, якая ўдзельнічае ў выпрацоўцы грамадскай свядомасці, у актуалізацыі тых ці іншых каштоўнасцей, з'яўляецца універсальным фактарам многіх літаратурных тэндэнцый, вызначае шмат якія заканамернасці, з'яўляецца своеасаблівай крыніцай дынамікі развіцця слоўнага мастацтва. Адметнасць кожнай літаратуры вызначаецца, перш за ўсё, канцэпцыяй навакольнага свету і асобы, менавіта яна і знаходзіцца ў яе аснове.

Зыходным момантам у стварэнні канцэпцыі асобы ў літаратуры 60-х гадоў стала пераасэнсаванне характару "сярэдняга чалавека", наданне яму гуманістычнай значнасці. Менавіта пафас гуманізму з'яўляецца вызначальнаю рысаю ў творах многіх паэтаў гэтага перыяду.

Адказ на пытанне "Што такое Чалавечнасць і Чалавек?" імкнецца даць, напрыклад, Анатоль Вярцінскі. Філасофскай глыбінёй характарызуюцца яго вершы, што склалі зборнікі "Тры цішыні" (1965), "Чалавечы знак" (1969). Паэт займае актыўную пазіцыю непрымірымасці да фальшу, стварае вобраз чалавека – вечнага вандроўніка і шукальніка высокіх ідэалаў. Ва унісон з нашым паэтам выказваецца і рускі крытык А.Урбан: "Узвышэнне чалавека – не эпізод літаратурнага жыцця, не індывідуальная прыхільнасць некалькіх мастакоў, а агульны клопат, выкліканы глыбокай увагай да людзей, думкай пра іх будучыню, пра лёс краіны і Сусвету" [6, 248].

Ідэйнай жа асновай творчасці мастакоў слова 60-х гадоў XX стагоддзя стала філасофская канцэпцыя Чалавека, пачатак якой быў у многім пакладзены такімі кнігамі, як зборнік вершаў "Чалавек" літоўскага паэта Э.Межэлайціса, паэмы А. Твардоўскага "За даллю – даль", А. Куляшова "Цунамі". Паўнацэнным працягам адзначанай тэндэнцыі "ўзвышэння чалавека" сталі пошукі актыўнага героя многімі іншымі паэтамі.

Ідэйна-эстэтычная вартасць мастацкіх твораў 60-х гадоў пра чалавека вызначалася перамяшчэннем у маральна-этычны, філасофскі план размовы пра духоўны свет асобы, яе ўзаемаадносіны з гісторыяй, з сучаснасцю і будучыняй. Падобная творчая ўстаноўка фарміравала ў мастакоў слова якасна новыя прынцыпы творчасці ў цэлым, імкненне вылучыць у характарах людзей тыя рысы, што працуюць на перабудову светапогляду асобы ў святле, як тады здавалася, вечных камуністычных ідэалаў. Гэта быў час "трыумфу чалавечнасці і гуманізму" [5, 8].

У 1960-м годзе рускі паэт Яўген Вінакураў выпусціў зборнік лірыкі з характэрнай назвай "Твар чалавечы" і ў адным з праграмных вершаў "Як добра твар свой мець..." выказаў сваё разуменне задач літаратуры пераломнага перыяду жыцця: "Страшимся мы, как видно, неспроста // Быть, как искринки, схожи меж собою" [2, 123]. Праз год ім жа быў напісаны другі верш – "Разнообразие" – пра сэнс жыцця, прызначэнне чалавека на зямлі быць своеасаблівай індывідуальнасцю: "Разнообразье – принцип, // Лежащий в основе жизни" [2, 155]. "Мы" складаемся з "я" – вось пафас яго ж верша з лаканічным загалоўкам "Я". "У перыяд дынамічнага абнаўлення жыцця і росту самасвядомасці < ... > праблема чалавек і маса, асоба і калектыў была адной з галоўных, калі не галоўнай, у маральным жыцці грамадства" [4, 25], – піша Уладзімір Конан. Так адмаўлялася мастацтва 50 – 60-х гадоў XX стагоддзя ад формулы, абвешчанай некалі У. Маякоўскім: "Единица – вздор, единица – ноль", і шукала шляхі паяднання адзінкавага і агульнага, лучнасці "Я" і "Мы".

Вызначальным для рамантычна настроенай паэзіі сярэдзіны 50 – 60-х гадоў быў і матыў свабоды. Перш за ўсё паэты мелі на ўвазе свабоду выбару, народжанага канфліктам паміж чалавекам і соцыумам. Герой-рамантык звычайна адзінокі, узвышаецца над грамадствам, не прыняты, "пагарджаны" ім (Купалава вызначэнне). "Вот стою я на Тверском бульваре, Миру непонятный человек" [3, 12], – заяўляе пра сябе лірычны герой Я. Вінакурава. Яшчэ больш шырока разгорнуты гэты тэзіс у вершы гэтага ж аўтара "Дэман", напісаным у лермантаўскім рамантычным ключы.

Беларуская рамантычна настроеная паэзія акрэсленага перыяду таксама не пазбегла лермантаўскага матыву незадаволенасці існым станам рэчаў і экзістэнцыяльнай бунтоўнасці супраць любых праяў сацыяльнай несправядлівасці, яскравым прыкладам арыгінальнай інтэрпрэтацыі якога якраз і з'яўляецца лірыка Анатоля Сербантовіча.

**Заключэнне.** Гуманістычны пафас паэзіі 60-х гадоў XX стагоддзя выклікае "ўзвышэнне асобы", пошукі актыўнага героя, паказ сучаснасці ў кантэксце мінулага і будучыні, а таксама



Репозиторий ВГУ

абумоўлівае фактар вяртання літаратуры да вечных чалавечых каштоўнасцей, да адраджэння маральнасці асноў жыцця ў духу нашаніўскага перыяду. Паэты стварылі канцэпцыю чалавека, згодна якой асоба аказалася здольнай пераадолець усе перашкоды на сваім шляху, аднак такі чалавек змог дзейнічаць толькі ў межах адведзенага яму тэксту, на ўмоўнай і зададзенай у многім тэрыторыі.

Спіс літаратуры


1. Арочка, М. Беларуская савецкая паэма. / М. Арочка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 335 с.
2. Винокуров, Е. Избранные произведения: В 2 т. / Е. Винокуров. – М.: Художеств. лит., 1976. – Т. 1: Стихотворения. – 544 с.
3. Винокуров Е. Контрасты. / Е. Винокуров. – М.: Совет. писатель, 1975. – 127 с.
4. Конан У. Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору. / У. Конан. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 238 с.
5. Мішчанчук М. Літаратура, народжаная Кастрычнікам. / М.І. Мішчанчук. – Мінск: Нар. асвета, 1983. – 107 с.
6. Урбан А. Возвышение человека. Заметки о современной поэзии. / А.Урбан. – Л.: Художеств. лит. Ленингр. отд-ние, 1968. – 248 с.


## ЧЕЛОВЕК И ВОЙНА В РАССКАЗЕ В. БЫКОВА «В ПЕРВОМ БОЮ»: ОПЫТ ТОЛСТОВСКОЙ ТРАДИЦИИ


*С.В. Лапунов*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Среди исследований по истории русско-белорусских литературных связей, достаточно широко представлены работы, посвященные проблеме освоения белорусской литературой художественных достижений русской военной прозы второй половины XIX века. Наиболее разработанный в белорусском литературоведении аспект указанной проблемы – влияние на белорусскую военную прозу XX века художественного опыта Л.Н. Толстого. Следует отметить, что объектами большинства исследований избирались крупные эпические произведения (повести, романы, романные циклы), тогда как «малым» жанрам белорусской военной прозы уделено недостаточно внимания.

Цель исследования – выявить взаимосвязь художественных решений в дебютном военном рассказе В.Быкова с опытом классика русской военной прозы XIX столетия – в связи с изложенным выше представляется нам закономерной.

**Материал и методы**. Указанное выше обстоятельство обусловило наше обращение к первому военному рассказу В. Быкова «В первом бою», (1949, впоследствии на белорусский язык автором не переведен). Выбор произведений обусловлен следующими причинами. Во-первых, как уже давно признано исследователями, традиция «лейтенантской прозы», представителем которой является Быков, восходит «к общему источнику – к Толстому» [1, с. 539]. Во-вторых, мы учитывали значение раннего периода для дальнейшего творчества писателя. Обращение к самым разным темам на раннем этапе творчества приводит к утверждению военной темы как основной в творчестве. В-третьих, сам Быков признавал ценность для него как для писателя толстовского художественного опыта и особую важность мысли, высказанной Толстым в финале второго севастопольского рассказа [2]. Для реализации поставленной цели выбраны аналитический и сопоставительный методы.

**Результаты и их обсуждение.** Обращаясь к вопросу толстовского влияния на поэтику белорусской военной прозы, А.М. Адамович отмечал, что своими произведениями Толстой показал, «сколько в правде неожиданностей и поворотов»[1, с. 615]. Установка на изображение «неожиданностей и поворотов» войны стала ведущей в творчестве Быкова уже на раннем этапе творчества. Обращение к показу войны во всей ее сложности и противоречивости, интерес к внутренней жизни человека в экстремальных обстоятельствах обусловили обращение писателя к опыту классика русской военной прозы.

Наибольшее внимание в ранних военных рассказах Быкова проявлено к классической для военной прозы ситуации испытания первым боем – неслучайно дебютный военный рассказ писателя назван «В первом бою». Первое серьезное испытание, которое проходит герой рассказа, приобретает тот же смысл, что и в военной прозе Толстого: оно заставляет осознать подлинную сущность войны, избавляет от прежних иллюзий, открывает прежде недоступное сознанию. Уже в самом начале рассказа передано состояние напряженного ожидания первого боя, которое испытывает центральный герой произведения – недавно назначенный командиром

Репозиторий ВГУ